# ГОРАД НАВІНЫ

ПАЭЗІЯ

# Галіна Лазіцкая: «Люблю родную зямлю, памятаю свае карані»



ФОТА ГАЛІНЫ ЛАЗІЦКАЙ

Кожная пятніца - роднае, сваё!
апранай адзенне і абутак мясцовых вытворцаў
гатуй з мясцовых прадуктаў
транслюй і слухай беларускую музыку
чытай і размаўляй на беларускай мове
дай зніжку на родныя тавары
ствары сваю ўласную пятніцу
Далучайся!
#ДзеньРоднагаСвайго
#ДеньРодногоСвоего
Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь

**Сёння ў гасцёўні нашай рэдакцыі пісьменніца Галіна ЛАЗІЦКАЯ.**

Галіна Іосіфаўна – адна з пастаянных удзельніц літаратурнага клуба «Пінчукі», які дзейнічае пры цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц. Яна жаданы госць творчых вечарын у бібліятэках і школах. Маючы дваіх сыноў, сем унукаў і нават праўнучку, яна застаецца прыгожай жанчынай і цудоўным чалавекам, які любіць родную зямлю і памятае свае карані.

## Карані

Галіна нарадзілася ў вялікай сям'і ў вёсцы Сінін Пінскага раёна. Ёй запомнілася, як тата браў гармонік, і ўсе разам – бацькі і пяцёра дзяцей – спявалі.

– У той час, калі я была яшчэ маленькая, у вёсцы не было нават радыё. Мабыць, таму людзі вельмі любілі спяваць, – успамінае пісьменніца. – Калі тата граў на гармоніку, то ўсе збіраліся ў гурт. Ці то было свята, ці чакалі кароў з пашы, ці проста пасля працы мужчыны і жанчыны рабілі сабе культурны адпачынак – заводзілі спевы, танчылі. Пераважна парамі танцавалі – вальс, кра-

паўплываў школьны настаўнік рускай мовы і літаратуры Іван Пятровіч Канановіч. Ён вельмі любіў вершы, натхнёна іх дэкламаваў. Урокі западалі ў душу, з'яўляўся палёт фантазіі, хацелася марыць, у галаве нараджаліся вобразы, якія пераўтвараліся ў радкі. Тыя – у вершы. Дарэчы, дзяўчына многа чытала. У тым ліку і газеты, якіх у савецкі перыяд жыхары вёсак і гарадоў краіны выпісвалі многа. Сярод іх Галіна выдзяляла «Палескую праўду», бо там друкаваліся вершы мясцовых паэтаў. «Вось бы ўбачыць сапраўднага жывога паэта», – марыла дзяўчына. Прозвішчы ўсіх, хто друкаваўся ў мясцовай прэсе, яна ведала на памяць. Такія людзі здаваліся іншаземцамі.

З паступленнем у 1983 годзе ў сельскагаспадарчы тэхнікум на заатэхніка летуценнасць дзяўчыны скончылася. Марыць проста не было часу. Вучоба, праца, сям'я і дапамога бацькам былі ў прыярытэце.

Са студзеня 2014 года Галіна Лазіцкая працуе ў Пінскай цэнтральнай бальніцы.

## Муза вярнулася зноў

леская праўда», «Заря», «Народная трыбуна», «Сельская газета», «Знамя юности», часопісе «Гаспадыня». Пазней паспрабавала свае сілы ў прозе.

У 2017 годзе Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказала ёй Падзяку за папулярызацыю твораў на беларускай мове.

Па выніках конкурсу «Кароткае апавяданне–2017», абвешчанага Брэсцкім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, стала пераможцай.

У 2019 годзе выйшла ў свет першая аўтарская кніга паэзіі і прозы «Прайсці поруч».

Па выніках рэспубліканскага конкурсу творчых пісьмовых работ «За што я люблю родную зямлю» Галіне Лазіцкай прысуджаны дыплом у намінацыі «Краязнаўчы далягляд».

У Х адкрытым літаратурным конкурсе клуба «Катарсіс» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта ў намінацыі «Проза» заняла першае месца. Быў уручаны дыплом пераможцы і спецы-

**Мой край**

Грудзі поўніць гонар, радасць хвалі:
Прада мною родны, мілы край.
Не заманяць казкай былі-далі,
Як не скажаш здраднага «бывай».
Да цябе ў любові выраслі,
Песціў нас, да волі гартаваў
Край, дзе мары плёнам акрылялі,
Дзе надзеям нашым паспрыяў.
Любы край, цябе не спішуць у Лету,
Тваю шчодрасць славяць землякі,
Існа дбаюць, шчыра ўносяць лепту,
Каб ты стаў адзіным на вякі.

**Першы гром**

Пярун у гневе кідае маланкі,
Паўсюль разносіць рэха
моцны гром.
Жыва прыкмета
ў клопаце сялянскім:
«На дрэвы голыя –
не да ўраджая ён!»
Былі б яны ў вопратцы зялёнай,
Тады б і слаў грымоты на зямлю.
Касяк дажджу прагнаў бы
скрозь па гонях,
Каб наталіць зляжалую раллю.
– Ды дай жа, Божа,
будзем з ураджаем!
І літасці, дабра будзем чакаць.
– Прыкмета што ж?
– Хай ліха нас мінае,
Нябёсам, пэўна,
лепш за нас відаць!

– заводзілі спевы, танчылі. Пераважна парамі танцавалі – вальс, кракавяк і іншыя. А яшчэ мой дзядуля расказваў нам казкі. Гэта запомнілася на ўсё жыццё, адлюстравалася недзе ў душы.

Пісьменніца адзначыла, што на станаўленне яе асобы таксама

## Муза вярнулася зноў

З 2008 года Галіна Лазіцкая пачала сур'ёзна займацца літаратурай, і ў 2013-м некалькі вершаў увайшлі ў склад калектыўнага зборніка пінскіх паэтаў «Созвездие любви». Друкавалася ў газетах «Пінскі веснік», «Палесся» заняла першае месца. Быў ураза» заняла першае месца. Быў уручаны дыплом пераможцы і спецыяльны дыплом члена журы Руслана Казлоўскага.

У снежні 2021-га атрымала дыплом I ступені ў намінацыі «Мова маёй зямлі» па выніках рэспубліканскага конкурсу творчых работ, прысвечаных Году народнага адзінства. У тым жа годзе ў чацвёртым выпуску альманаха «Берасцейская скарбніца» было надрукавана конкурснае апавяданне «Проста доктар».

лепш за нас відаць!

**Алена ЖУК**